РОДНАЯ ГАЗЕТА НА РОДНАЙ МОВЕ

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

8 СТУДЗЕНЯ 2025 г.
СЕРАДА
№ 3 (30391)

# «МЫ БУДЗЕМ РАБІЦЬ УСЁ ДЛЯ ТАГО, КАБ ЗАХАВАЦЬ МІР»

## Святочны дзень як найлепшая нагода пагаварыць аб самым важным



Фота БелТА.

Традыцыйна свята Раства Хрыстова Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка сустракае разам з вернікамі ў царкве. Сёлета кіраўнік дзяржавы наведаў храм Свяціцеля Мікалая цудатворца ў Лагойску. Месца ўнікальнае. Храм быў пабудаваны ў 1866 годзе і з'яўляецца помнікам архітэктуры. У 1907 годзе ў храм вернуты старажытны абраз Лагойскай Божай Маці, які лічыўся страчаным. У 1930-я гады храм быў зачынены і ператвораны ў збожжасховішча. Падчас Вялікай Айчыннай вайны службы тут аднавіліся і ўжо не перапыняліся. Пры царкве ёсць гаючая крыніца, якая выцякае з падножжа ўзгорка, на якім стаіць храм. Аляксандр Лукашэнка ў царкве запаліў святочную свечку. А затым пагутарыў з вернікамі. Размова хоць і не была абсалютна святочнай, але ж на самыя важныя тэмы.

### «ГЭТА ТЫЯ СВЯТЫ, ЯКІЯ НАША НЯПРОСТАЯ ГІСТОРЫЯ НЕ ЗМАГЛА СЦЕРЦІ З ПАМЯЦІ»

Віншуючы Прэзідэнта са святам Раства Хрыстова, настаяцель храма протаіерэй Уладзімір адзначыў, што падчас Боскай літургіі вернікі моляцца аб краіне. Протаіерэй Уладзімір пажадаў кіраўніку дзяржавы мірнага праўлення, здароўя, моцы і цялесных сіл, а таксама глыбокага міру ў душы, аб якім спявалі анёлы ў Віфлееме ў калядную ноч. «І, як пажаданне ад усіх жыхароў Лагойска, прыхаджан гэтага храма, я хачу, каб радасць ад гэтага свята заўсёды заставалася з вамі і з усімі намі», — адзначыў святар.

Прэзідэнт падзякаваў усім, хто прыйшоў у храм. «Я вельмі цаню, што вы прыйшлі, каб сустрэцца ў гэта светлае, святое свята», — адзначыў ён. Кіраўнік дзяржавы нагадаў свой тэзіс аб тым, што вельмі важна, каб у незалежнай дзяржавы былі ўстойлівыя і прызнаныя ўсімі людзьмі традыцыі. Па яго словах, адна з іх — гэта святы: Вялікдзень, Новы год, Дзень Перамогі, Раство. «Гэта тыя святы, якія наша няпростая гісторыя не змагла сцерці з нашай памяці. Я ўпэўнены, што гэтыя святы ў нашых сэрцах назаўжды», — заўважыў Аляксандр Лукашэнка. Ён павіншаваў усіх са светлым святам Раства Хрыстова. «Я хачу, каб яно прынесла ўсім нам радасць. Каб вы радзей засмучаліся. Каб зусім не засмучаліся — такога не бывае, вы гэта цудоўна разумееце. Таму я вам жадаю як мага радзей засмучацца. І, перш за ўсё, каб вашы дзеткі вас ніколі не засмучалі», — пажадаў кіраўнік дзяржавы.

### «ГОД БУДЗЕ ЦЯЖКІМ, АЛЕ МЫ ЎСЁ ПЕРААДОЛЕЕМ»

Аляксандр Лукашэнка пагаварыў з жыхарамі Лагойска і аб галоўных тэмах наступнага года. «У царкве не хлусяць, я заўсёды гэта памятаю і заўсёды пра гэта гавару. Лепш прамаўчаць, калі не хочаш гаварыць», — заўважыў ён. Прэзідэнт папярэдзіў, што будучы 2025 год будзе няпростым. «Няпростым не толькі таму, што нас разам з Расіяй пачалі ціснуць і душыць з усіх бакоў. Пакуль тая тактыка і стратэгія, якую мы вызначылі, дапамагае нам не толькі ўтрымацца на плаву, але і жыць годна. Скажам шчыра, што кожны жыве так, як ён хоча. Вось гэта я ўжо магу сёння спакойна сказаць. Чаму? Таму што, калі ты хочаш жыць лепей, у нашай дзяржаве такія ўмовы створаны. Хочаш лепш (Гасподзь заўсёды намякаў на гэта), трэба проста больш працаваць. Не будзеш працаваць (вы гэта цудоўна ведаеце), ніколі лепш ці нават добра жыць не будзеш. Таму мы пераадолеем усе складанасці і цяжкасці наступнага года», — сказаў ён.

Кіраўнік дзяржавы растлумачыў, што ўсе цяжкасці звязаны не толькі з ціскам збоку на нашу дзяржаву. 2025 год будзе складаным яшчэ і таму, што ў нашых сяброў і суседзяў, з якімі мы гандлюем (а гандлёва-эканамічныя адносіны — гэта аснова жыцця кожнай дзяржавы), сітуацыя няпростая.

СТАР. 2–3

АДМЕТНАСЦІ «МАРАФОНУ АДЗІНСТВА» Ў САЛІГОРСКУ 4–5



ДЗІЦЯЧАЯ КАЗКА Ў ПАЛАЦЫ НЕЗАЛЕЖНАСЦІ 4–5



Яшчэ больш цікавых навін па-беларуску — у нашым тэлеграм-канале @zviazdaby. Падпісвайцеся, чытайце, будзьце ў курсе!

TikTok

ISSN 1990 — 763X
25003>
9 771990 763008

НА ЎЛАСНЫЯ ВОЧЫ

# «МАЯ БЕЛАРУСЬ» — НАША ЎЧОРА, СЁННЯ І ЗАЎТРА

## Пабывалі на выставе ў новым комплексе «БелЭкспа»: дзелімся ўражаннямі

Першы беларускі электрамабіль
і сімулятар кіравання трактарам,
магчымасць набыць лекі ў робата-аптэкара
і атрымаць глазураваны сырок
у робата-дэгустатара, «памерацца ростам»
з колам БелАЗа і адчуць на далонях
«зорны пыл»... Калі вам не хапіла
яркіх навагодніх уражанняў —
свята для дзяцей, ды і для сябе асабіста,
можна падоўжыць,
пабываўшы на выставе дасягненняў
«Мая Беларусь».

СТАР. 6–7



# «МЫ БУДЗЕМ РАБІЦЬ УСЁ, КАБ ЗАХАВАЦЬ МІР»

Паводле слоў Аляксандра Лукашэнкі, калі б было нармальна ў іх, у нас было б вельмі добра. «Таму я вас папярэджваў і папярэджваю яшчэ раз, што новы год будзе няпростым. Ён будзе цяжкім. Але мы яго пераадолеем. Мы пераадолеем усе гэтыя цяжкасці, мы неадночы з імі сутыкаліся літаральна ў апошні час, і пандэмію мы перажывалі, і санкцыі перажывалі. Калі мы адзіныя, калі мы разам, калі мы хоць бы глядзім у адзін бок аднолькава, тады ў нас усё будзе добра», — адзначыў беларускі лідар.

## «ГАЛОЎНЫ ВЫКЛІК — ГЭТА ЭКАНОМІКА»

Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу на тое, што і ўнутры краіны праблем хапае, і выклікі з'яўляюцца пастаянна, амаль кожны месяц. Адным з апошніх выклікаў, якія насельніцтва магло і не заўважыць, дзякуючы рабоце адказных асоб, Прэзідэнт назваў вымушаную міграцыю людзей, якія ўцякаюць ад вайны. Паводле яго слоў, Расію гэта праблема даўно зацягнула, Беларусь жа да нядаўняга часу Бог мілаваў.

**Мяне ўжо інфармуюць, што пачынаюць падцягвацца людзі з Усходу, не толькі тыя, якія жадаюць нам нейкай варожасці і вайны. Не. Падцягваюцца людзі, якія жадаюць жыць, працаваць, зарабляць і нейкую капейку пасылаць на радзіму, каб пракарміць сваіх дзяцей. Але ўся бяда ў тым, што гэтыя людзі далёкія ад тых спраў, якія мы вырашаем. Яны некампетэнтныя, прафесійна непадрыхтаваныя. Гэта таксама нястрашна, галоўнае, каб гэтыя людзі хацелі працаваць і вучыцца. Наш народ можа навучыць людзей, працоўныя рэсурсы нам патрэбныя. Але некантраляваная міграцыя — гэта бяда», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.**



Фота БелТА

**На памяць аб гэтай сустрэчы Прэзідэнту падарылі абраз Божай Маці «Знаменне» Лагойская. У старажытнасці горад Лагойск быў памежным горадам полацкай зямлі. Абраз Прасвятой Багародзіцы «Знаменне» Лагойская вядомы на землях Беларусі са старажытных часоў. Яшчэ полацкі князь Барыс Усяслававіч (1054—1128), родны брат бацькі прападобнай Ефрасінні Полацкай, на сваіх пячатках і грашовых пломбах адлюстроўваў абраз Божай Маці «Знаменне». У 30-х гадах XX стагоддзя выява абраза была згублена, але па захаваных фатаграфічных малюнках жыхарамі Лагойска падчас Вялікай Айчыннай вайны была напісана копія абраза на палатне. Па благаславенні Патрыяршага Экзарха ўсяе Беларусі мітрапаліта Філарэта беларускім іканапісцам Паўлам Жаравым у 2000 годзе быў напісаны новы абраз Прасвятой Багародзіцы «Знаменне» Лагойская.**
**А Прэзідэнт, у сваю чаргу, падарыў храму абраз Божай Маці «Смаленская». Яшчэ адна кранальная традыцыя гэтага свята — букет белых руж настаяцелю храма. І, вядома ж, салодкія падарункі самым маленькім прыхаджанам.**

Ён падкрэсліў, што ў Беларусь уцякаюць розныя людзі. І праз нашу краіну назіраецца вялікі транзіт мігрантаў на Захад. Кіраўнік дзяржавы адказаў на абвінавачанні ў тым, што беларусы дапамагаюць у гэтай міграцыі: «Я заўсёды быў сумленны. Мы нікога ад мігрантаў бараніць не будзем. Асабліва тых, хто ўводзіць супраць нас эканамічныя санкцыі. Што такое санкцыі? Гэта эканамічны ціск, каб мы не развіваліся, каб нам было цяжэй і складаней. Дык чаму мы павінны іх абараняць?»

Прэзідэнт звярнуў увагу, што нядаўна Уладзімір Зяленскі крычаў: «Жыве Беларусь». «Ну жыве, натуральна жыве, — іранічна заўважыў Аляксандр Лукашэнка. — Ён, праўда, сказаў, што хутка па ўсёй Беларусі ўсе будуць гэты лозунг прамаўляць — «Жыве Беларусь». Ён нібыта намякаў, што хутка ў нас будзе так, як ва Украіне. Я так падумаў, пачуўшы яго: крый божа. Таму выклікаў хапае. Але галоўны выклік — гэта эканоміка. Будзем разам трымацца, будзем імкнуцца зрабіць лепш. Каб лепш жылося — мы пераадолеем і гэтыя выклікі».

**Галоўнае, паводле слоў беларускага лідара, каб быў мір. Ён запэўніў, што ў Беларусі будзе зроблена ўсё магчымае, каб захаваўся мір. «Будзе мір — усё астатняе, як я кажу, мы купім. Будзем жыць, можа быць, небагата, але годна. Як жывём цяпер, ні ў каго нічога не просім. Мы жывём на тыя грошы, тыя сродкі і магчымасці, якія мы рэалізоўваем у Беларусі. Таму для нас галоўнае — захаваць мір», — заявіў Аляксандр Лукашэнка.**

Ён звярнуў увагу, што яго часта крытыкуюць за словы аб міры. «Я разумею, што калі не будзе міру — нічога не трэба», — адказаў на гэта Прэзідэнт. У прыклад ён прывёў суседзяў, у якіх сотнямі тысяч гінуць людзі; бруд і ўсё астатняе, што нясе вайна, — там. «Нам гэта трэба? Нам гэта не патрэбна. Таму мы будзем рабіць усё, каб захаваць мір», — канстатаваў кіраўнік дзяржавы.

## «САМАЕ ГАЛОЎНАЕ — МЫ ЎМЕЕМ ЧУЦЬ НАШЫХ ЛЮДЗЕЙ, СЛУХАЦЬ НАШЫХ ЛЮДЗЕЙ»

Аляксандр Лукашэнка вярнуўся да тэзіса, які агучваў у навагоднім звароце. Будучы час, асабліва наступная пяцігодка, — гэта змена пакаленняў. «Трэба падрыхтаваць маладое пакаленне, наступнае пакаленне нашых дзяцей, якое возьме ў рукі Беларусь і будзе яе берагчы, цаніць, хоць бы так, як мы з вамі, цяперашняе пакаленне, аберагалі яе і зрабілі гэтую краіну суверэннай і незалежнай. Упершыню ў гісторыі», — сказаў Прэзідэнт. Ён звярнуў увагу, што змена пакаленняў — гэта заўсёды балючы працэс. Але паабяцаў правесці яго так, каб ніякага болю беларусы не заўважылі.

Паводле слоў Прэзідэнта, у краіне будзе працягвацца рэалізацыя палітыкі сацыяльна арыентаванай дзяржавы. Ён заўважыў, што многія могуць паставіцца да гэтага скептычна.

**Павінен вам сказаць: тое, што мы робім для людзей у Беларусі, ні ў адной краіне не робіцца. Самае галоўнае — мы ўмеем чуць нашых людзей, слухаць нашых людзей», — адзначыў кіраўнік дзяржавы.**

Ён прывёў некалькі прыкладаў. На днях будуць адкрытыя апошнія артэзіянскія свідравіны, якія будуць забяспечваць Мінск чыстай артэзіянскай вадой. Практыка ўзяцця вады з адкрытых крыніц, яе ачышчэння ў сталіцы больш прымяняцца не будзе. Усё ж артэзіянская вада куды лепшая. Ён растлумачыў, што ўвогуле Мінск спажывае больш за 400 тысяч куб. м вады за суткі і трэба яшчэ гарантаваць водазабеспячэнне з падземных крыніц у аб'ёме 120-130 тысяч куб. м. «Мы гэта для каго робім? Для свайго народа», — заўважыў Прэзідэнт. Ён звярнуў увагу, што не ўсе краіны займаюцца гэтым пытаннем. «Але мы гэта зрабілі, бо я ведаю, што людзі запомняць гэта назаўжды. Сапраўдныя людзі будуць удзячныя, таму што паветра, вада, наша харчаванне — гэта аснова жыцця», — сказаў Аляксандр Лукашэнка, звярнуўшы ўвагу, што ў астатніх гарадах крытычных праблем з вадой няма. Яшчэ адзін прыклад — дарогі. Прэзідэнт нагадаў, што ў мінулым годзе літаральна штурмам бралі гэтыя вышыні. Ён адзначыў, што сёння кожная сям'я мае аўтамабіль, а то і два-тры. А значыць, патрэбныя вялізныя сродкі для таго, каб падтрымліваць дарогі ў нармальным стане. Кіраўніком дзяржавы пастаўлена задача: усе раённыя цэнтры з аграгарадкамі звязаць дарогамі з цвёрдым пакрыццём. «Мы павінны, як бы ні было складана, на працягу наступнага года ў краіне пераадолець гэтае няшчасце. Для каго гэта зроблена? Гэта для людзей, — расказаў кіраўнік дзяржавы. — Таму сацыяльна арыентаваная дзяржава — гэта калі дзяржава глядзіць у бок народа». Паводле слоў Аляксандра Лукашэнкі, гэта не азначае,

# УСЁ ДЛЯ ТАГО,



што дзяржава будзе працаваць за кожнага чалавека, гэта не яе роля. Ён звярнуў увагу, што ў дзяржавы свае функцыі. Але за апошнія гады яны значна пашыраныя. Прэзідэнт прывёў яшчэ адзін прыклад: у кожнай вёсцы ёсць свае стандарты. У большасці яны выконваюцца. Кіраўнік дзяржавы паабяцаў, што на гэта пытанне будзе звернута ўвага, паколькі першы год пяцігодкі якасці — Год добраўпарадкавання. Таму, паводле яго слоў, у вёсцы, не гаворачы ўжо аб аграгарадках, павінны быць створаны ўмовы для людзей, вобразна кажучы, павінен гарэць хоць адзін ліхтар, каб людзі маглі бяспечна перамяшчацца па вуліцы. Гаворачы аб вёсцы, Аляксандр Лукашэнка падзяліўся сваёй турботай: «Мы ўсё захвальваем нашу моладзь. Так, у нас нядрэнная моладзь, яна такая як ёсць, іншай не будзе. Але мяне непакоіць тое, што наша моладзь не так, як мы з вамі, прыхільная да працы». Таму, паводле яго слоў, перад краінай у будучыні будзе стаяць сур'ёзны іспыт.

> **Нам трэба вызначыць нармальную ўладу, нармальнага Прэзідэнта, урад, які будзе ўказваць той шлях, па якім будзе развівацца наша краіна. Мы ад гэтага нікуды не падзенемся. У гэтым сутнасць змены пакаленняў, — сказаў Аляксандр Лукашэнка. — Я не аб тым, што я заўтра ўцяку куды-небудзь. Пакуль ёсць здароўе, я буду з вамі, на любой пасадзе буду працаваць, каб захаваць тое, што мы з вамі стварылі сваімі рукамі».**

## «У АСНОВЕ ПАВІННА БЫЦЬ СПРАВЯДЛІВАСЦЬ»

Паводле слоў кіраўніка дзяржавы, і ён палічыў важным аб гэтым нагадаць менавіта ў гэты дзень, у аснове павінна быць справядлівасць. «Несправядлівасці быць не павінна», — канстатаваў ён. Адсюль, звярнуў увагу Прэзідэнт, умяшанні дзяржавы ў пытанні цэнаўтварэння. «І гэта не рэгуляванне цэн, як некаторыя гавораць. Абсалютна не».

> **Мы не збіраемся рэгуляваць цэны. Гэта сёння немагчыма ў рыначнай эканоміцы. Гэта не тыя савецкія часы, калі на ўсё ўстанаўліваліся цэны. Павінна быць створана сістэма самарэгулявальная. Яна не павінна душыць бізнес, вытворчасці. Калі селянін нешта вырабляе, чаму мы павінны яму ўказваць, дзе і па якім кошце ён павінен прадаваць прадукцыю? Няхай прадае. Але ён павінен памятаць, што ён вырабіў, а людзі, якія з ім побач, купляюць, і яны павінны мець магчымасць купіць гэтую прадукцыю», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.**

Паводле яго слоў, такая ж сітуацыя з прамысловымі таварамі. Можна зрабіць колькі заўгодна трактароў, але не факт, што сельгаспрадпрыемствы, фермеры будуць у стане іх купіць. Таму трэба стварыць самарэгулявальную сістэму, якая будзе садзейнічаць устанаўленню справядлівасці. Гэта, паводле слоў Прэзідэнта, дасць магчымасць вырашыць праблему, калі прыбытак ад продажу прадукцыі вывозіцца за мяжу.

> **Памятаць мы павінны, што выгоды ў краіне стварае народ. І ты павінен з гэтага прыбытку тое, што належыць народу, аддаць, а не набіваць сабе кішэню. У гэтым прынцып справядлівасці. Калі такой справядлівасці няма, мы прыйдзем да вайны», — заявіў Аляксандр Лукашэнка.**

Ён нагадаў, што ва Украіне ўсе праблемы пачаліся з несправядлівасці, калі з'явіўся вялізны клан алігархату, які задушыў краіну. І паціху гэты алігархат прывёў Украіну да вайны. «Той жа Зяленскі, ён жа нябедны чалавек. Таму ў каго грошы ў кішэні вялізныя заробленыя, яны моцна цісняць. І тады ты ўжо не будзеш думаць аб дзяржаве, ты будзеш думаць аб гэтых грашах. І там усе прэзідэнты былі такія. Таму ўсё пачынаецца з несправядлівасці», — сказаў Аляксандр Лукашэнка. Паводле яго слоў, у Беларусі ўсе пытанні па цэнах, па аплаце працы і іншыя будуць вырашацца па справядлівасці. «Тое, што зароблена ў Беларусі, павінна заставацца ў Беларусі. Гэта не павінна вывозіцца. Грошы зарабіў — вывез за мяжу, там у банках размясціў або нейкае прадпрыемства адкрыў. Чаму мы павінны на кагосьці працаваць? Усё павінна заставацца ў Беларусі», — зрабіў акцэнт кіраўнік дзяржавы. Ён адзначыў, што на гэтыя і іншыя пытанні справядлівасці ў найбліжэйшы час будзе звернута асаблівая ўвага.

## «Я ЛЮБЛЮ СВОЙ НАРОД, І Ў ГЭТЫМ МАЯ АСАБЛІВАСЦЬ»

Аляксандр Лукашэнка растлумачыў, што выступіў з гэтай нясвяточнай прамовай, каб людзі разумелі: усе цяжкасці можна пераадолець толькі разам. «Ніякі Прэзідэнт, ніякі ўрад вас не выратуе, калі ён (ці Прэзідэнт) будзе ісці ў адным напрамку, а вы ў іншым. Калі мы будзем ісці з вамі ў нагу, як ішлі дзесяцігоддзі мінулыя, мы выйдзем з гэтай няпростай сітуацыі. Мы пераадолеем усе складанасці і цяжкасці», — сказаў ён. Кіраўнік дзяржавы яшчэ раз павіншаваў усіх са святам і пажадаў усім здароўя і радасці. «Давайце будзем працаваць у імя будучыні нашых дзяцей», — сказаў ён.

Протаіерэй Уладзімір падзякаваў Прэзідэнту за словы, якія ішлі ад сэрца. Ён адзначыў, што ў прамове кіраўніка дзяржавы адчувалася любоў да ўсіх беларусаў. «Я люблю свой народ, і ў гэтым мая асаблівасць. Выбачайце за нясціпласць», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

> **Трыццаць гадоў таму я пакляўся, што буду служыць свайму народу. І я гэта раблю». Кіраўнік дзяржавы заўважыў, што за гэты час усялякае бывала. Але грубых памылак дапушчана не было. Ён звярнуў увагу, што краіна ішла па тонкім лёдзе, які ні разу не праламаўся.**

І гэта Аляксандр Лукашэнка назваў галоўным дасягненнем беларусаў. Паводле яго слоў, у цяперашні цяжкі час, калі вакол кіпяць страсці, неабходна захаваць свой астравок міру, як бы гэта ні падабалася апанентам. «Калі нас уцягнуць у вайну, будзе цяжкая сітуацыя. Мы можам не вытрымаць як дзяржава. Таму мы цярплівыя, настойлівыя, як царква нас вучыць, робім сваю справу. Час усё адбудзе. Час дасць усім адзнаку. Нам трэба вытрымаць. Няхай гавораць, што дыктатура, яшчэ штосьці. Слухайце, лепей такая дыктатура, як у Беларусі, чым такая дэмакратыя, як ва Украіне. Нам трэба вытрымаць», — падкрэсліў Прэзідэнт. Ён заўважыў, што за ўладу не трымаецца.

> **Я зраблю ўсё для таго, каб ціха, спакойна перадаць гэтую ўладу новаму пакаленню. Бо я спадзяюся яшчэ пры новай уладзе, і вы таксама, пажыць. Мае дзеці будуць жыць. Я хачу бачыць, як яны будуць жыць. Мае — не тое, што гэта маё дзіця. Мае дзеці — вось гэтыя (тыя, што ў храме. — «Зв.»). Я хачу бачыць, як яны будуць жыць. Вось мая мэта. Таму гэта вялікая мая перавага, што я не спрабую сілай неяк утрымаць уладу», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.**

Ён звярнуў увагу, што наш народ перажыў цяжкія часы, прайшлі гэта. Дзякуючы гэтаму людзі паразумнелі. «Мы цяпер падвяргаемся і душэўным, і псіхалагічным нападам жорсткім. Але народ жа трымаецца. Прыязджаюць да нас госці і зайздросцяць: гасцінныя, добрыя, спагадлівыя. Гэта чаму? Таму што народ наш добры. Ад кораня. Яны трымаюцца», — заўважыў кіраўнік дзяржавы.

**Валерыя СЦЯЦКО,**
*г. Лагойск.*



СПЕЦЫЯЛЬНЫ РЭПАРТАЖ

# ВЫСТУПЛЕННІ ПАД ЗЯМЛЁЙ, «ЗНАКАВЫЯ СУСТРЭЧЫ» І ЯРКІЯ ЭМОЦЫІ

## Чым быў адметны «Марафон адзінства» ў Салігорску?

У першыя паслянавагоднія выхадныя ў сталіцы шахцёраў было горача. Тут 3 і 4 студзеня праходзіла рэспубліканская грамадска-культурная акцыя «Марафон адзінства». Тысячы чалавек паўдзельнічалі ў гэтай знакавай падзеі, наведалі цікавыя выставы, папрысутнічалі на сустрэчах і выступленнях артыстаў, адчулі сапраўдны настрой усеагульнага яднання. Муралы, квэсты, інтэрактывы і святочны настрой — вось чым жылі салігарчане і госці горада ў гэтыя дні. Заключным акордам «Марафону адзінства» стаў традыцыйны канцэрт «Час выбраў нас». Карэспандэнт «Звязды» далучыўся да гэтай яркай, масавай і светлай акцыі пачатку новага 2025 года.

### ЧЫМ УРАЗІЛА ВЫСТАВА «МАЗ-СПОРТАЎТА»

Другі дзень марафону пачаўся з адкрыцця мурала «Будучыня ў тваіх руках» на адной з дзевяціпавярховак на праспекце Міру. А каля лядовага палаца было асабліва шматлюдна. Там размясцілася выстава тэхнікі «МАЗ-СПОРТаўта». Гасцям і жыхарам горада прадставілі аўтамабіль МАЗ-5309RR, які прымаў удзел у гонках у Перу і Расіі. Яркая афарбоўка аўто і тэхнічныя параметры прыцягвалі ўвагу не толькі дзяцей, але і людзей старэйшага ўзросту, якія жадалі зрабіць фатаграфію на фоне аўтамабіля-спартсмена.

«Гэта машына прымала непасрэдны ўдзел у спаборніцтвах. Мадэль адноўленая да першапачатковага стану і цяпер з'яўляецца гістарычнай часткай нашай каманды і ўсяго аўтаспорту Беларусі, — расказаў журналістам механік спартыўнай каманды Канстанцін Дубовік. — А выступаем мы цяпер ужо на капотнай канфігурацыі, якая больш дасканалая».

На «Марафоне адзінства» спартсмены не ўпершыню. Разам з акцыяй яны ўжо паспелі наведаць і іншыя буйныя гарады краіны.

### «ГЭТА ЎСЁ МАЁ РОДНАЕ»

У другі дзень «Марафону адзінства» ў Салігорску каля Палаца спорту адбыўся квэст «Гэта ўсё маё роднае», удзел у якім узялі 42 каманды, больш за 400 чалавек. Каманды былі сфарміраваны ад пяці да дзесяці чалавек. Ім трэба было прайсці ўсе дзесяць станцый, на якіх неабходна было адказаць на тэматычныя пытанні або выканаць цікавыя заданні.

Некаторыя з яркіх і запамінальных пляцовак можна было пачуць здалёк. На станцыі «Песняры» ўдзельнікам квэсту неабходна было адгадаць знакамітыя кампазіцыі. Але была і загвоздка, бо песні ўключаліся наадварот. На станцыі «Бульба дэнс» неабходна было паўтарыць танцавальны флэшмоб. Пераможцы квэсту атрымалі прызы ад БРСМ, Беларусбанка і арганізатараў акцыі «Марафон адзінства».

### ВЫСТУПАЛІ І ПАД ЗЯМЛЁЙ!

Адметнасцю «Марафону адзінства» ў Салігорску стала выступленне Прэзідэнцкага аркестра ў падземным памяшканні Рэспубліканскай бальніцы спелеалячэння. Яна працуе на базе першага рудаўпраўлення ААТ «Беларуськалій». Бальніца з'яўляецца адзінай дзейнай установай у свеце, якая практыкуе немедыкаментозны метад лячэння з ужываннем падземнай спелеатэрапіі ў калійных рудніках.

«Кажуць, «Марафон адзінства» толькі там, наверсе. Але не, акцыя тым і ўнікальная, што можа «спусціцца» нават пад зямлю. Канцэрту ў шахце папярэднічала вялікая падрыхтоўка. Дарэчы, за падтрымку нашай ініцыятывы хочацца падзякаваць кіраўніцтву ААТ «Беларуськалій». Эксперымент атрымаўся. І самае галоўнае — меры бяспекі пры гэтым былі выкананы. Усё прайшло на найвышэйшым узроўні», — адзначыў **дырэктар Палаца Рэспублікі Максім ПРЫХОДСКІ**.

**Галоўны дырыжор і мастацкі кіраўнік аркестра Віталь КУЛЬБАКОЎ** адзначыў, што выступленне ў спелеалячэбніцы не стала складанасцю для калектыву: «Наверсе, на тэрыконах, мы ўжо пабывалі на 20-годдзі Прэзідэнцкага аркестра і 25-годдзі Палаца Рэспублікі. Там праходзілі здымкі. Але гэты канцэрт, вядома, — цікавая для нас практыка. Безумоўна, трохі хваляваліся, пакуль не спусціліся і не ўбачылі, як выдатна ўсё арганізавана, то ўсе страхі сышлі. А яшчэ тут цудоўная акустыка».

Пад зямлёй музыканты ўдастоіліся гучных пахвал. Найлепшым напамінам аб выступленні стануць фота ў сацсетках, якія гледачы рабілі ў вялікіх колькасцях. А яшчэ — уражанні, якіх, як вядома, зашмат не бывае.

### «ЧАС ВЫБРАЎ НАС»

Па добрай традыцыі неад'емнай часткай «Марафону адзінства» стала «Знакавая сустрэча». У якасці аўтарытэтных спікераў выступілі палітычны аглядальнік Ігар Тур, заслужаны дзеяч мастацтваў Беларусі Яўген Алейнік, заслужаны артыст Беларусі Валерый Шмат, прадзюсар Андрэй Гузель і галоўны рэдактар «Альфа Радыё» Вадзім Шэпет. У фармаце нефармальнай размовы спікеры абмеркавалі новыя магчымасці для таленавітых беларусаў, сакрэты стварэння тэлевізійных праектаў і многае іншае.

> **«У вельмі складаны час для краіны адзінства павінна быць не толькі ў тым, што Прэзідэнт адзін за ўсіх. Але і мы ўсе, як працяг гэтай фразы, павінны быць усе за аднаго», — звярнуў увагу палітычны аглядальнік Ігар Тур.**

Гучным заключным акордам свята стаў традыцыйны гала-канцэрт «Час выбраў нас».



Урачысты старт канцэрта дала **Старшыня Савета Рэспублікі Наталля КАЧАНАВА**. Звярнуўшыся да ўсіх прысутных, яна перадала словы прывітання ад кіраўніка дзяржавы: «Я шчыра радая сёння быць тут, на гэтым «Марафоне адзінства». І вельмі сімвалічна, што ў першыя дні новага года марафон праходзіць менавіта тут, у маладым горадзе Салігорску. Я шчыра радая перадаць вам словы прывітання і добрыя пажаданні ад нашага Прэзідэнта, паважанага Аляксандра Рыгоравіча Лукашэнкі. **Гэты марафон — падарунак беларускаму народу ад нашага кіраўніка дзяржавы**».

Спікер Савета Рэспублікі адзначыла, што Салігорск — малады горад са слаўнай гісторыяй: «Сюды ў далёкім 1958 годзе прыехалі маладыя людзі з усяго Савецкага Саюза на Усесаюзную ўдарную камсамольскую будоўлю, каб на адкрытым геолагамі радовішчы пабудаваць горад і камбінат. Вядома, сваім нараджэннем горад абавязаны калійнаму камбінату. Мабыць, у кожнага беларуса Салігорск асацыюецца з «Беларуськаліем».

Ён сёння — гэта больш за 15 тысяч людзей, якія працуюць на галоўным прадпрыемстве ў Салігорску, гэта амаль 20 працэнтаў сусветнага рынку ўгнаенняў, гэта 300 кіламетраў падземных тунэляў і 140 краін, у якія пастаўляецца прадукцыя.

«Але так было не заўсёды. Былі цяжкія часы, і пасля развалу Савецкага Саюза прадпрыемства апынулася на мяжы выжывання. Знаходзілася нямала тых, хто хацеў прыватызаваць, выкупіць за бясцэнак гэтае народнае багацце. Прэзідэнт цвёрда сказаў: «Не, свае прадпрыемствы мы нікому не аддадзім», — нагадала Старшыня Савета Рэспублікі.

Яна таксама звярнула ўвагу, што зусім нядаўна на тэлеэкранах паказалі Марш шахцёраў у Мінск у 90-я гады: «Шахцёры рабілі гэта ад безвыходнасці. Таму што не выплачвалася заработная плата, не было дзяржаўнай падтрымкі, і прадпрыемства знаходзілася ў такім стане. І тады Прэзідэнт прыняў рашэнне: дзяржаўнай падтрымцы быць! Ён падтрымаў усе інвестпраекты, якія рэалізоўваліся на гэтым прадпрыемстве. І прадпрыемства пачало сур'ёзна працаваць, умацоўваючы эканоміку не толькі Салігорска і Мінскай вобласці, але ў цэлым эканоміку нашай краіны».

Наталля Качанава адзначыла, што Салігорск называюць багатым горадам, дзе ў людзей высокія заробкі: «Але зусім нядаўна на нарадзе з вучонымі Прэзідэнт выразна сказаў: заробак у шахцёраў зароблены, кожны рубель паліты потам. Шахцёрам плацяць за вынік, у нашай краіне людзям плацяць за вынік».

Спікер Савета Рэспублікі дадала, што Салігорск — гэта не толькі «Беларуськалій». У горадзе працуе больш чым 20 прадпрыемстваў, прадукцыю якіх ведаюць нават за межамі Беларусі: «У горадзе працуюць домабудаўнічы камбінат, прадпрыемства лёгкай прамысловасці «Купалінка». І тут жывуць выдатныя людзі, атмасфера цудоўная, інфраструктура развітая». Наталля Качанава адзначыла, што ў горадзе ствараюцца ўсе ўмовы, каб людзі жылі, працавалі, адпачывалі.

Наталля Качанава падкрэсліла, што 2025-ы стане важным для нашай краіны:

> **«Зусім хутка, праз некалькі тыдняў, мы будзем выбіраць будучыню свайго народа і сваёй краіны. І калі мы хочам жыць у такой жа цудоўнай краіне, якую мы любім, якой мы ганарымся, мы павінны зрабіць абсалютна правільны выбар. Час выбраў нас, а мы будзем рабіць выбар для сваёй краіны. І мы не павінны памыліцца.**



> **Мы павінны дакладна разумець, што работа Прэзідэнта — гэта жыццё, пакладзенае на алтар сваёй краіны. І мы з вамі павінны зрабіць усё для таго, каб у гэты няпросты час захаваць нашу краіну мірнай, спакойнай, добраўпарадкаванай, прыгожай. Думаю, што мы зробім абсалютна правільны выбар».**

Яркім і маштабным застанецца ў памяці салігарчан «Марафон адзінства» і асабліва канцэрт беларускіх артыстаў «Час выбраў нас». Маштабнае шоу не пакінула абыякавымі сваіх гледачоў. Для многіх з іх здзейснілася мара: салігорцы змаглі на свае вочы ўбачыць любімых артыстаў.

У завяршэнне канцэрта **старшыня Мінскага аблвыканкама Аляксандр ТУРЧЫН** сказаў: «Ведаеце, быццам бы ўчора мы давалі старт «Марафону адзінства» ў Маладзечне. А вось ужо ён прайшоў практычна па ўсёй краіне і вярнуўся ў Мінскую вобласць, у Салігорск. Я злавіў сябе на думцы, што Мінская вобласць адзіная можа пахваліцца тым, што «Марафон адзінства» праходзіў у нас у розныя гады: у 2024 годзе — у Маладзечне і ў 2025-м — у Салігорску».

Па словах губернатара, гэты год асаблівы, па-першае, 80-годдзе Вялікай Перамогі, па-другое, падыходзіць да канца чарговая пяцігодка: «Паверце, Мінскай вобласці ёсць чым ганарыцца за пяцігадовы шлях. Дзіцячыя садкі, дарогі, прадпрыемствы, вытворчасці — можна бясконца пералічваць нашы поспехі. Але іх не было б, калі б не падтрымка Прэзідэнта. Мінскай вобласці, як ні адной іншай, ён аддае столькі ўвагі».

Асобна кіраўнік вобласці спыніўся на надыходзячай электаральнай кампаніі: «Літаральна праз некалькі тыдняў нас чакае найважнейшая грамадска-палітычная падзея гэтага года — выбары Прэзідэнта краіны. Мне здаецца, няма неабходнасці нікому нічога тлумачыць. Трэба проста прыйсці на выбарчыя ўчасткі і зрабіць свой правільны выбар».

Ужо ў наступныя выхадныя «Марафон адзінства» завітае ў Ліду. Сачыце за навінамі ў наступных нумарах газеты «Звязда» і на нашым сайце zviazda.by. Будзе вельмі цікава!

**Даніїл ХМЯЛЬНІЦКІ,**
**фота БелТА,**
*г. Салігорск.*






Традыцыйна ў Палацы Незалежнасці падчас зімовых канікул праводзіцца серыя навагодніх спектакляў. Падчас канікул тут з'біраюцца па запрашэнні Прэзідэнта дзеці рознага сацыяльнага статусу, у тым ліку дзеці-сіроты, дзеці са шматдзетных і няпоўных сем'яў. Некаторыя з іх атрымалі магчымасць наведаць гэта святочнае мерапрыемства дзякуючы поспехам у вучобе, талентам і актыўнай грамадскай дзейнасці. Для дзяцей наведванне Палаца Незалежнасці стала сапраўдным навагоднім падарункам.

# ДЗІЦЯЧАЯ КАЗКА Ў ПАЛАЦЫ НЕЗАЛЕЖНАСЦІ

## Маленькіх гасцей таксама чакалі квэсты, майстар-класы, конкурсы і падарункі ад Прэзідэнта

Упершыню сёлета арганізоўваць такое адказнае мерапрыемства даручылі Беларускаму дзяржаўнаму тэатру юнага гледача.

— Мы неймаверна рады гэтаму, таму што хто, як не мы, павінны ведаць, як зрабіць добрую казку для дзяцей, — адзначыла **дырэктар Беларускага дзяржаўнага тэатра юнага гледача Вера ПАЛЯКОВА**.

Напачатку маленькіх гасцей сустракалі казачныя персанажы: совы, ваўкі, эльфы, лісы, вавёркі і мядзведзі. За гэты кароткі час яны паспелі добра пасябраваць з дзецьмі: гулялі з імі ў «даганялкі», праводзілі конкурсы, разам рабілі навагоднія паштоўкі, фатаграфаваліся ў сэлфі-люстэрку. Затым запрасілі паглядзець спектакль. Ён быў пастаўлены пад жывы гук з удзелам вялікай колькасці артыстаў-прафесіяналаў, якія ўзаемадзейнічалі з гледачамі, імгненна рэагавалі на тое, што адбываецца ў зале, і трымалі глядацкую ўвагу на працягу ўсяго часу. Дарэчы, упершыню ў пастаноўцы ТЮГа быў выкарыстаны штучны інтэлект: відэа, якое суправаджала казку, зроблена ім цалкам.

Паколькі мерапрыемства праходзіла ў зале ўрачыстых цырымоній Палаца Незалежнасці, прадставілася цудоўная магчымасць зрабіць не проста казку для дзяцей, а цэлы квэст. У фармаце гэтай залы, па словах Веры Паляковай, такі варыянт найлепшы для правядзення святочнага мерапрыемства.

— Стварыць тут атмасферу, як у тэатры, складаней, але нам, здаецца, удалося. Казка атрымалася добрая, захапляльная, пра сапраўднае сяброўства і любоў. Галоўны герой — хлопец, які сядзіць у глядзельнай зале і роўна такі ж, просты і шчыры, як тыя дзеці, якія прыйшлі сёння паглядзець пастаноўку.



Мілана Чачэрына і Дар'я Драйко прыехалі на мерапрыемства з Бабруйска. Для абедзвюх дзяўчынак запрашэнне паглядзець казку ў Палацы Незалежнасці стала прыемнай нечаканасцю:

— Бацькі сказалі, што мяне запрасілі паглядзець пастаноўку ў Мінску. Я вельмі ўзрадавалася, бо ніколі раней тут не была і нават не чакала, што будзе такая насычаная праграма: і майстар-класы, і магчымасць зрабіць фатаграфіі з любімымі персанажамі, і, вядома, пастаноўка, — адзначыла Мілана. — У адным з майстар-класаў я ўжо нават паспела паўдзельнічаць: зрабіла свечку сваімі рукамі. Я так рада, што адзін дзень сваіх канікулаў правяла тут — уражанняў хопіць надоўга!

— Мама сказала, што за выдатную вучобу ў школе мяне запрасілі ў Мінск у Палац Незалежнасці паглядзець пастаноўку, — расказала Дар'я. — Я была вельмі рада і хутчэй хацела трапіць сюды. Вядома, не чакала, што тут так прыгожа, святочна і што для гледачоў арганізуюць квэсты і майстар-класы. Мне ўсё вельмі спадабалася. З нецярпеннем чакаю, калі раскажу бацькам, якая тут цудоўная атмасфера!

Адзінаццацігадовая Ксенія Барада ў Палац Незалежнасці таксама прыехала ўпершыню. Для яе новы год пачаўся вельмі шчасліва: пад ёлкай знайшла ўсе жаданыя падарункі, а чацвёртага студзеня адправілася ў доўгачаканае падарожжа ў Мінск, каб паглядзець пастаноўку ў рэзідэнцыі Прэзідэнта:



— На такіх мерапрыемствах я ніколі раней не бывала. Цікава было глядзець пастаноўку, нават шкада, што так хутка праляцеў час. Вельмі насмяшылі мяне казачныя героі. Яны з намі і карагоды павадзілі, і сфатаграфаваліся. Хацелася паспець паўдзельнічаць ва ўсіх прапанаваных майстар-класах. Спадзяюся, я тут не ў апошні раз!

Напрыканцы мерапрыемства дзяцей чакалі падарункі ад Прэзідэнта.

**Яна ВАЛАСАЧ.**
**Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.**

# «МАЯ БЕЛАРУСЬ» — НАША ЎЧОРА,







*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

...На падыходзе нас сустракае экспазіцыя на адкрытай пляцоўцы: тут прадстаўлена розная тэхніка — ад беспілотнага трактара «Беларус» да... танка. Так, сапраўднага танка.

Дарэчы, менавіта ён карыстаецца асаблівым попытам у наведвальнікаў — на ім з задавальненнем фатаграфуецца малеча, якая ўяўляе сябе будучымі абаронцамі Радзімы. Між іншым, тут таксама прадстаўлены камбайны «Гомсельмаш», розная іншая тэхніка.

На экспазіцыйнай плошчы Міжнароднага выставачнага цэнтра наведвальнікі могуць азнаёміцца з найбольш значнымі дасягненнямі беларускай навукі, культуры, эканомікі і, як адзначаюць арганізатары, «убачыць будучыню краіны праз яе сучаснасць». Гэтым маштабным праектам адкрыўся новы выставачны цэнтр 28 снежня і, дзякуючы выставе ў першыя дні 2025 года, МВВЦ стаў адной з найбольш папулярных лакацый сталіцы. Для зручнасці наведвальнікаў велізарная экспазіцыя падзелена на тэматычныя лакацыі («Культурная спадчына», «Разумны горад», «Навука і інтэлект», «Клопат і здароўе», «Атамная энергія», «Сельская гаспадарка», «Спартыўная краіна», «На варце» і г. д.). За святочную атмасферу адказвае зона культурных праектаў, дзе кожны дзень адбываюцца відовішчы — ад тэатральных і кінапаказаў да дыялогавых пляцовак. Кожны тыдзень прысвечаны пэўнаму рэгіёну: канцэрты падрыхтавала кожная вобласць.

Але ж якія цікавыя магчымасці адкрывае выстава перад наведвальнікамі? Вось зусім няпоўны спіс — насамрэч іх значна больш...

У дзень новы вялізны выставачны комплекс можа прымаць каля 15 тысяч гасцей. І ў першыя студзеньскія дні людзей тут было, так бы мовіць, «на поўную загрузку». Уразіць сучаснага наведвальніка, асабліва маладога, — задача не з лёгкіх. Але арганізатарам выставы «Мая Беларусь» гэта, здаецца, удалося. Шмат у чым — дзякуючы стаўцы на інтэрактыў. Проста на ўваходзе гасцей сустракае велізарны бусел з крыламі-экранамі. Ідзём наперад і трапляем у месца, дзе нараджаюцца ўспаміны аб дзяцінстве, тактыльныя адчуванні хлебнай руні, карацей кажучы, інтэрактыўнага месца, дзе да ўраджаю можна літаральна дакрануцца рукой. Прычым на апошніх хвілінах сонца, якое адыходзіць да сну... Нараджаецца адчуванне лёгкасці і непарыўнай сувязі з бацькоўскай хатай, родным куточкам сваёй зямлі.

Далей — болей. Інтэрактыў на гэтым не заканчваецца. Спачатку — гукі роднай краіны: ад спеву птушак да дзіцячага смеху.

Акрамя таго, сваю краіну можна не толькі пачуць, але і адчуць яе водар. У розных праявах: духмянай гарбаты з ліпавым мёдам і свежымі абаранкамі, смалістага лесу з ядлоўцам, смачнага застолля з салам, салёным агурком і часнаком, ягадных «пацерак» з суніц і чарніц, што нанізвалі малымі на травіну і з задавальненнем потым з'ядалі... М-м-м-м... Смаката!

Што парадавала: на лакацыі «Лугавыя травы» разам са зборам духмяных траў — чабору, каласоў, палыну — побач стаіць кніжка «Летнім часам» Якуба Коласа, выдадзеная ў нашым Выдавецкім доме «Звязда».

## ПАСЯДЗЕЦЬ ЗА РУЛЁМ ТРАКТАРА І ПАДАЦЬ КАРОВУ

Але гэтым інтэрактыў не абмяжоўваецца. Лічбавы трэнажор трактара BELARUS 3522 дазваляе адчуць сябе трактарыстам у рэальнасці, на полі. Да яго прыйшлося выстаяць чаргу (сімулятар цікавіў не толькі дзятву, але і дарослых). А калі вам захацелася паспрабаваць сябе ў якасці аўтамеханіка, то з дапамогай акуляраў віртуальнай рэальнасці можна адшукаць няспраўнасць сельгасабсталявання. Сімулятар, дарэчы, не забаўка, а інавацыйны спосаб навучання студэнтаў БДТУ.

Будучыня — за дакладным земляробствам, і лакацыя «Сельская гаспадарка» прапануе азнаёміцца, напрыклад, з работай аградронаў, якія ўжо апрабаваныя на палях вопытных гаспадарак Нацыянальнай акадэміі навук. Тут жа можна, надзеўшы VR-акуляры, «здзейсніць экскурсію» на малочнатаварны комплекс новага пакалення або, напрыклад, азнаёміцца з працай сістэмы тэхнічнага зроку для сартавання і ўпакоўкі пладовай прадукцыі. А можна па-старому падаць карову рукамі. Карова не сапраўдная, але ў натуральную велічыню, а з вымя яе цячэ сапраўднае (напэўна) малако. Да яе таксама выстраілася чарга, у асноўным мамы з дзецьмі.

## ПАПРАСІЦЬ СЫРОК У РОБАТА

Учора, сёння і заўтра айчынную лёгкую прамысловасць дэманструе стэнд канцэрна «Беллегпрам». Тут можна наведаць віртуальную экскурсію на знакаміты Аршанскі льнокамбінат, убачыць модныя распрацоўкі беларускіх дызайнераў, пафантазіраваць пра «калекцыі будучыні». Масток ад віртуальнай рэальнасці да «рэальнай» перакідваюць майстар-класы: ад роспісу посуду (Добрушскі фарфоравы завод) да модных спосабаў шнуроўкі абутку («Белвест»). А на стэндзе айчыннага харчпрама ўсеагульную цікавасць выклікаў робат-дэгустатар, які частаваў усіх ахвотных шакаладнымі батончыкамі і глазураванымі сыркамі. Выбіраеш варыянт на панэлі кіравання, і робат беспамылкова выдае менавіта выбраную табой слодыч. З кіраваннем цуда-машыны імгненна асвоіліся нават тыя малыя, каму няма яшчэ і двух гадоў.

## ДАВЕДАЦЦА АБ РАСПРАЦОЎКАХ ГЕНЕТЫКАЎ

Стэнд «Медыцына і фармацэўтыка» таксама імкнецца ўразіць наведвальнікаў. Тут прадстаўлены распрацоўкі ў самых розных кірунках:

**ООО «Деловая оценка»** (организатор аукциона) по поручению **ОДО «Паласстрой»** (продавец) извещает о проведении **11 февраля 2025 года** открытого аукциона по продаже имущества в 12.00 по адресу: Гомельская обл., г. Гомель, ул. Жарковского, д. 24, каб. 3-2.

| Наименоваие имущества |
| --- |
| **Лот № 1:** Автомобиль GEELY ATLAS, год выпуска 2019, VIN № Y4K8742Z5KB311080, рег. № 3555 КВ-3 |
| **Начальная цена** продажи без НДС – 42 400,00 бел. руб. |
| **Задаток** – 424,00 бел. руб. |

**Продавец: ОДО «Паласстрой»**, г. Гомель, пр-т Ленина, д. 31, к. 2. Конт. тел. +375445335588.

**Шаг аукциона – 5 % от начальной цены лота в фиксированной сумме.**

**Для участия в аукционе необходимо:**

**1.** Оплатить задаток на расчетный счет **Организатора аукциона ООО «Деловая оценка»: р/с BY60BELB30121322650030226000 в филиале ОАО «Банк БелВЭБ», г. Гомель, пр-т Ленина, 10, БИК BELBBY2X, УНП 490870026.**

**2.** Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов по адресу: г. Гомель, ул. Жарковского, д. 24, каб. 3-2, в рабочие дни с **10.00 до 13.00** и **с 14.00 до 17.00** от даты опубликования настоящего извещения. **Прием заявлений для участия в аукционе заканчивается 10.02.2025 г. в 17.00.**

Порядок участия и проведения аукциона с перечнем необходимых документов опубликован на сайте www.deloocenka.by.

**Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона не позднее, чем за 3 (три) дня до его проведения.** Единственный участник имеет право приобрести лот с шагом 5 %. Победителем торгов будет признан участник, предложивший более высокую цену. Лицо, являющееся победителем торгов, обязано: подписать протокол о результатах аукциона; заключить договор купли-продажи в течение **10 (десяти)** рабочих дней с момента подписания протокола; оплата должна быть произведена в течение **10 (десяти)** рабочих дней после подписания договора купли-продажи. Возместить затраты на организацию и проведение аукциона и оплатить вознаграждение организатору торгов в течение **5 (пяти) рабочих дней** с момента подписания протокола. Задатки, уплаченные участниками аукциона, ставшими победителями, будут учтены в счет окончательной стоимости предмета оценки. Проводится аукцион в соответствии с Положением Общества с ограниченной ответственностью «Деловая оценка» «О порядке организации и проведения аукционов по продаже имущества и права на заключение договоров аренды нежилых помещений (их части)».

**Конт. тел. организатора аукциона: +375 (232) 34-62-36, +375 (44) 750-40-03, +375 (29) 303-30-62.**

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

| | |
| --- | --- |
| **Организатор аукциона/оператор** | ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 5. УНП 191224638. www.ipmtorgi.by |
| **Продавец** | ООО «БИП-С Плюс», г. Минск, ул. Короля, дом 3, к. 41в. УНП 190575262 |
| **Предмет электронных торгов:** | |
| **Административно-хозяйственное помещение** (Административное помещение), инв. № 160/D-9672, общ. пл. 692,9 м², по адресу: ***Брестская обл., г. Пружаны, ул. Октябрьская, д. 104-1*** | |
| **Начальная цена лота с НДС 20 % – 65 000,00 долл. США*** | |
| **Примечание: цена продажи Предмета электронных торгов фиксируется в протоколе о результатах электронных торгов в сумме в белорусских рублях, эквивалентной цене продажи лота в долларах США по курсу НБ РБ на дату проведения электронных торгов* | |
| **Задаток 5 %** от начальной цены предмета электронных торгов перечисляется в белорусских рублях (BYN) по курсу Национального банка Республики Беларусь на день оплаты на счет BY92BELB30120048350080226000 в ОАО «Банк БелВЭБ», г. Минск, ул. Мясникова, 32; БИК BELBBY2X; ОКПО 378531865000, получатель платежа – ООО «ИПМ-Консалт оценка», УНП 191224638 | |
| **Срок подписания договора купли-продажи: 10 (десять) рабочих дней** со дня завершения электронных торгов | |
| **Срок оплаты предмета электронных торгов: 15 (пятнадцать) рабочих дней** после заключения договора купли-продажи | |
| Порядок проведения электронных торгов, критерии выявления победителя торгов, порядок оформления участия в торгах и результатов торгов установлены регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by | |
| Победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить вознаграждение **4 %** от цены продажи лота в течение 3 рабочих дней после проведения электронных торгов | |
| Организатор электронных торгов имеет право снять предмет аукциона с электронных торгов в любое время до момента определения победителя электронных торгов, без объяснения причин снятия | |
| Предыдущее извещение опубликовано в газете «Звязда» от 05.12.2024 г. | |
| **Дата и время начала и окончания электронных торгов: 23.01.2025 г. с 11.00 до 13.00.** Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов | |
| **Дата и время окончания приема заявок:** заявки на участие в электронных торгах принимаются по 22.01.2025 г. до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by | |
| **Контактные данные** | **Тел.: +375 17-373-21-33; +375 (44) 704-92-06. E-mail: info@ipmtorgi.by** |

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

**Организатор электронных торгов:**

**Комитет государственного имущества Гродненского областного исполнительного комитета,**

Гродненская обл., г. Гродно, ул. 17 Сентября, 39, тел.: 8 (0152) 62 39 32, 62 39 31, 62 39 23, 62 39 24.

**Оператор электронной торговой площадки:** ОАО «Белорусская универсальная товарная биржа».

**Торги проводятся 31.01.2025** на электронной торговой площадке «БУТБ-Имущество», **www.et.butb.by.**

**Время торгов** устанавливается инструментарием площадки в автоматическом режиме.

**Продавец:** Производственное коммунальное унитарное предприятие «Волковысское коммунальное хозяйство», тел.: (801512) 2 51 97, 2 06 03, 2 07 46, 5 13 44.

Предмет электронных торгов:

**Казарма с составными частями и принадлежностями, тепловая сеть, наружная водопроводная сеть, наружная канализационная сеть:**

**Гродненская область, Волковысский район, Российский сельсовет, городской поселок Россь, улица Красноармейская, 47А, г. п. Россь, 85, 87, 89.**

Начальная цена предмета аукциона – 168,00 бел. рублей.
Размер задатка – 42,00 бел. рублей.

**Окончание приема заявлений** на участие в торгах – 28.01.2025 до 15.00.

**Срок внесения задатка –** не позднее даты и времени окончания приема заявлений на участие в торгах.

УНП 500042135

# СЁННЯ І ЗАЎТРА

ад стаматалогіі да рэпрадукталогіі і спартыўнай медыцыны.

— Асабіста мяне ўражвае распрацоўка, накіраваная на вырашэнне пытання генетычнай рызыкі невыношвання цяжарнасці, — распавядае **вядучы спецыяліст Інстытута генетыкі і цыталогіі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі Ганна СЕРАДА.** — Сёння гэта не прысуд. Маючы загадзя інфармацыю (на такую генетычную рызыку ўказвае наяўнасць парадку 27 генаў), выключыўшы экспрэсію гэтых генаў, жанчына атрымлівае ўсе шанцы вынасіць дзіця. Мы праводзілі анкетаванне парадку дзвюх тысяч жанчын пасля мінімум двух выпадкаў невыношвання цяжарнасці. З іх больш за 80 %, прайшоўшы тэставанне і атрымаўшы правільнае вядзенне цяжарнасці, станавіліся мамамі.

## ПАКРАТАЦЬ КАСМІЧНУЮ КАПСУЛУ

Пра «зорны пыл» — гэта, вядома, метафара. Але ўбачыць і нават пакратаць капсулу, у якой вярнулася на Зямлю першая касманаўтка суверэннай Беларусі Марына Васілеўская, ёсць магчымасць у кожнага, хто прыйшоў на выставу. Касмічная лакацыя — адна з самых папулярных у наведвальнікаў. У ліку найбольш запатрабаваных і аўтамабільная тэматыка. «Улюбёнцам публікі» стаў першы беларускі электрамабіль BelGee EX50. Мужчынская палавіна наведвальнікаў падрабязна распытвала пра тэхнічныя характарыстыкі машыны, жаночая — прасіла пасядзець за рулём і ацаніць камфортнасць салона.

Прадстаўлена на выставе і вялікая лакацыя, прысвечаная культуры, гісторыі і традыцыям нашай краіны. Тут можна ўбачыць унікальныя музейныя экспанаты, падзеленыя па абласцях, што характарызуюць непаўторнасць кожнага рэгіёна.












## ЯК ТРАПІЦЬ НА ВЫСТАВУ?

Уваход на ўсе гэтыя мерапрыемствы і на саму выставу — бясплатны.

Для тых, хто на ўласным транспарце, — «заганіце» ў навігатар адрас — вул. Паліны Мядзёлкі, 24 — і наперад! Перад ММВЦ прадугледжана 2,2 тысячы паркавачных месцаў. Але і на грамадскім транспарце дабрацца сюды таксама нескладана. Па-першае, да новага выставачнага цэнтра ўжо ходзіць аўтобус № 26д, а па-другое, на час працы выставы арганізаваны два дадатковыя аўтобусныя маршруты: 912э (ад станцыі метро «Акадэмія навук») і 962э (ад станцыі метро «Пушкінская»).

Застаецца дадаць, што сустракаюць гасцей выставы «Мая Беларусь» не толькі «віртуальнымі» пачастункамі. Адна з самых прыцягальных лакацый — кірмаш, дзе можна пакаштаваць самую розную кулінарыю — ад кафетэрыя ГУМа да меню камбінатаў школьнага харчавання. Прычым па самых дэмакратычных цэнах: дранікі прапануюць па 3,5 рубля, безалкагольны глінтвейн — 2,5 рубля, гарбату — 1,5 рубля. Карацей, асалода будзе не толькі вачам, але і страўніку.

## ЯК ПРАЦУЕ ВЫСТАВА?

Па выхадных — з 11.00 да 21.00, у буднія дні — з 12.00 да 21.00.

Панядзелак — выхадны.

### ЛЮДЗІ КАЖУЦЬ

***Святлана Іванаўна з Мінска:***

— Прыехалі сёння ўсёй сям'ёй, не пашкадавалі. Ёсць на што паглядзець і што паказаць дзецям. Гэта наш айчынны гонар — нашы дасягненні. Замест таго каб тысячу разоў сказаць, што і як у нас вырабляецца, дастаткова адзін раз тут апынуцца і ўбачыць на ўласныя вочы. Я вельмі задаволена ад таго, што мы тут убачылі!

***Сям'я Іванчыкавых. Бацька сямейства Алег Міхайлавіч кажа:***

— Выбраліся ўсе разам — з бабуляй, дзецьмі, нават сябрамі — і рады таму, што не засталіся дома! Тут, сапраўды, сабрана ўсё самае лепшае, што ёсць у краіне па ўсіх галінах: лёгкай прамысловасці, сельскай гаспадаркі, машынабудавання. Мы ўсе вельмі ўражаныя ад убачанага!

***Да яго далучаецца жонка Аліна:***

— Ведаеце, увесь гэты інтэрактыў робіць сваю справу: я быццам апынулася ў дзяцінстве, калі бяжыш басанож на траве, адчуваеш водар траў, а потым дакранаешся да спелых каласоў далонямі. Заплюшчыла вочы, і я — у вёсцы, бабуля кліча на падворак заганяць і даіць кароў (гэтаму я навучылася з маленства). А на прыпечку чакае вячэра: малочная зацірка ці бульба з кіслым малаком. Хоць ты не расплюшчвай вочы...

***Мацвей, 9 гадоў:***

— А мне спадабаўся лічбавы цір — я нават трапіў у дзясятку! І наогул тут столькі ўсяго цікавага!

**Аляксандра АНЦЭЛЕВІЧ, Маргарыта ЗАРОЎКІНА, фота аўтараў.**


ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ТОРГОВ

**Унитарное предприятие «Могилевское отделение БелТПП» 11 февраля 2025 г. в 14.00 проводит торги по продаже следующих объектов**

| № п/п | Наименование объекта продажи | Основные технические и эксплуатационные характеристики | Начальная цена продажи составляет с учетом НДС 20 %, белорусских рублей | Задаток, белорусских рублей |
|---|---|---|---|---|
| **Лот № 1** | **Капитальное строение с инвентарным номером 712/D-8694** | Назначение – торговое помещение, наименование – хозяйственный магазин. Общая площадь – 1070,4 кв. м, расположенное по адресу: Могилевская область, Кировский район, Мышковичский с/с, аг. Мышковичи, ул. Дворцовая, д. 25-7 на земельном участке с кадастровым номером 722582201601000570 площадью 0,5232 га | 151 200,00 (сто пятьдесят одна тысяча двести рублей 00 копеек) | 15 120,00 (пятнадцать тысяч сто двадцать рублей 00 копеек) |

**Собственник имущества:**

Открытое акционерное общество «Рассвет им. К.П. Орловского», 213944, Республика Беларусь, Могилевская область, Кировский р-н, а. г. Мышковичи, ул. Орловского, 24, тел. +375223770601, тел. для осмотра объектов продажи +375223770615.

**Организатор торгов:** унитарное предприятие по оказанию услуг «Могилевское отделение Белорусской торгово-промышленной палаты», г. Могилев, ул. Циолковского, 1.

**Место проведения торгов:** г. Могилев, ул. Циолковского, 1, к. 112, унитарное предприятие «Могилевское отделение БелТПП».

Лот № 1 продается без условий на торгах в форме открытого аукциона с применением метода повышения начальной цены, с шагом 5 (пять) процентов от предыдущей названной аукционистом цены. Победителем торгов признается участник, предложивший наивысшую цену.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, предоставившие организатору торгов, в сроки, указанные в извещении, следующие документы: заявление на участие в торгах; копии учредительных документов (для юридических лиц) и свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); доверенность представителю юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения торгов; соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения торгов (в двух экземплярах); копию платежного поручения о внесении задатка, заверенную банком. Задаток перечисляется на расчетный счет: унитарное предприятие «Могилевское отделение БелТПП» р/с № BY88ALFA30122641790010270000 в ЗАО «Альфа-Банк», г. Могилев, BIC: ALFABY2X, УНП 700016628; физическим лицам – предъявить паспорт; иные документы в соответствии с Положением «О порядке организации и проведения торгов по продаже объектов, находящихся в собственности юридических лиц и индивидуальных предпринимателей Республики Беларусь, организуемых унитарным предприятием «Могилевское отделение Белорусской торгово-промышленной палаты».

**Условия регистрации, участия в торгах размещены на интернет-сайте организатора по адресу: www.mogilev.cci.by.**

**Срок заключения договора купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем)** – в течение 10 рабочих дней после проведения торгов.

Срок оплаты за предметы торгов на условиях заключенного договора купли-продажи.

**Торги состоятся 11 февраля 2025 г. в 14.00 по адресу: г. Могилев, ул. Циолковского, 1, к. 112, унитарное предприятие «Могилевское отделение БелТПП».**

Срок подачи заявления: с момента выхода публикации настоящего извещения в рабочие дни с 9.00 до 12.00 и с 14.00 до 15.00 по адресу: г. Могилев, ул. Циолковского, 1, к. 112. **Последний срок подачи заявления – 10 февраля 2025 г. до 12.00.**

Регистрация участников торгов 11 февраля 2025 г. с 13.30 до 14.00 по адресу: г. Могилев, ул. Циолковского, к. 112, унитарное предприятие «Могилевское отделение БелТПП».

**Телефоны для справок: (0222) 778032, +375 44 735 00 30 –** Жилина Ольга Александровна.



ВНИМАНИЮ ПРЕДПРИЯТИЙ, ОРГАНИЗАЦИЙ И ИНДИВИДУАЛЬНЫХ ПРЕДПРИНИМАТЕЛЕЙ!

**Комитетом государственного имущества Гродненского областного исполнительного комитета проводятся аукционы по продаже неиспользуемого имущества, находящегося в собственности Волковысского района**

К ПРОДАЖЕ ПРЕДЛАГАЮТСЯ:

**1) Объекты бывшего в/г: мастерская, наружная водопроводная сеть, тепловая сеть, объекты благоустройства (дорожка, проезд) по ул. Красноармейской, 52, в г. п. Россь Росского с/с Волковысского района.**

Начальная цена предмета аукциона – 4 базовые величины.

Размер задатка – 1 базовая величина.

**2) Объекты бывшего в/г, комплекс № 12: здание АЗС, пункт газификации кислорода № 74 с пристройкой, объекты благоустройства, инженерные сети, около г. п. Россь, Росского с/с, 34, 34/1, Волковысского района.**

Начальная цена предмета аукциона – 4 базовые величины.

Размер задатка – 1 базовая величина.

**3) Объекты бывшего в/г, комплекс № 14: здание СБВ лаборатории с беседкой, мощением, ограждением, калиткой, здание СБВ хранилища, около г. п. Россь, Росского с/с, 35, 35/1, Волковысского района.**

Начальная цена предмета аукциона – 2 базовые величины.

Размер задатка – 1 базовая величина.

Аукцион состоится **23.01.2025 в 12.00.**

Заявки на участие в аукционе принимаются по адресу:

**г. Гродно, ул. 17 Сентября, 39.**

Последний день подачи заявлений на участие в аукционе – **17.01.2025 до 16.00.**

Подробная информация по телефонам:

в городе Волковыске **8 (01512) 5 13 44, 2 06 03,**

в городе Гродно **8 (0152) 62 39 24, 62 39 23, 62 39 31.**

Дополнительная информация размещена на сайте:

**https://au.nca.by**

УНП 500042135

# КАЛЯДНАЯ КАРУСЕЛЬ

**Па гарызанталі: 1.** На Каляды ... рады, хлопцы семак прынясуць (прык.). **5.** «Саўка ды ... ладзілі дуду, // Павесяліцца з ёй на Каляду». З беларускай народнай песні «Саўка ды Грышка». **9.** «Лезь, каза, на ..., пакажы хамут». З калядный прыпеўкі. **11.** Тое, што і зімовішча. **12.** ... з бубнам; той, хто звычайна суправаджаў калядоўшчыкаў. **13.** «Прыехала Каляда на белым кані. // Яе конічак — ясны ...». З калядный песні. **14.** Узмацненне. **16.** Сельскі домік у гарах Швейцарыі. **18.** Мінерал, шклопадобны камень. **19.** Неабрэзаны край дошкі. **20.** Лугавая птушка; дзяркач. **22.** «Дзе ... рогам — там жыта стогам». З калядный песні. **27.** На Каляды — каўбаса, на Вяліндзень — сыр, а ўсё ... сыт (прык.). **29.** Калядная маска, якая сімвалізавала багацце і дабрабыт. **30.** Участак зямлі каля дома. **31.** ... на печку — сцюжа на двор (прык.). **32.** Абледзянелая скарынка на паверхні снегу. **33.** Адзін з галоўных дахрысціянскіх багоў; лічылася, што ў гонар яго пачалі святкаваць Каляды.

**Па вертыкалі: 2.** «Ах ты, зімачка, ... . // Любыя Калядачкі!» З верша М. Шакуна «Калядачкі». **3.** Прыстасаванне для далучэння праваду да машыны, прыбора. **4.** Страва з кавалачкаў мяса ў соусе. **6.** Невялікая рама. **7.** Сімвал хрысціянскай рэлігіі; у апошні дзень Калядаў яго малявалі на дзвярах, каб чорт не прабраўся ў хату. **8.** «Прыйшла Каляда, // ... адчыняйце!» З калядный песні. **10.** ... або вертэп. Народны лялечны тэатр, які некалі прысутнічаў на ўсіх калядных кірмашах. **15.** «Хай бульба родзіць, // Хай чарка ходзіць, // Хай патэльня трашчыць, // На ёй ... пішчыць». Пажаданне калядоўшчыкаў гаспадару хаты. **17.** ... або рабіна. Дрэва, ягадамі якога зімой любяць ласавацца птушкі. **18.** «Каляды, Калядачкі, // Бліны ды ...». З калядный прыпеўкі. **20.** Загадка. **23.** Частка твару. **24.** Бацька за ..., дзеці — за пірог (прык.). **25.** Каменная гара з крутымі схіламі. **26.** Бакавыя сценкі цыліндрычнага вырабу. **28.** Жаргон.

Склаў Лявон ЦЕЛЕШ, *г. Дзяржынск.*




**ПРАВЕРЦЕ, КАЛІ ЛАСКА, АДКАЗЫ:**

**Па гарызанталі:** 1. Дзеўкі. 5. Грышка. 9. Кут. 11. Зімоўе. 12. Музыка. 13. Месячык. 14. Рост. 16. Шале. 18. Апал. 19. Абза. 21. Драч. 22. Каза. 27. Чалавек. 29. Кабыла. 30. Агарод. 31. Кот. 32. Шарпак. 33. Дажбог.

**Па вертыкалі:** 2. Зіма. 3. Клема. 4. Гуляш. 6. Рамка. 7. Крыж. 8. Дзверы. 10. Батлейка. 15. Скварка. 17. Арабіна. 18. Аладачкі. 20. Шарада. 23. Шчака. 24. Парог. 25. Скала. 26. Юбка. 28. Арго.




## 8 СТУДЗЕНЯ Даты Падзеі Людзі




**1870** год — быў падпісаны сенацкі ўказ аб заснаванні ў Гомелі гарадскога грамадскага банка. Гэта — пачатковая дата ў гісторыі банкаўскай сістэмы Беларусі.

**1902** год — нарадзіўся (в. Збляны, цяпер у Зэльвенскім раёне) Антон Раманавіч Жэбрак, беларускі генетык і селекцыянер, грамадскі дзеяч, акадэмік НАН Беларусі, доктар біялагічных навук, прафесар), заслужаны дзеяч навукі Беларусі. Аўтар больш як 70 навуковых прац, прысвечаных гібрыдызацыі, паліплаідыі і селекцыі, галоўным чынам пшаніцы і грэчкі. Упершыню ў свеце атрымаў гібрыдныя пладавітыя формы ад скрыжавання многіх відаў пшаніцы.

**1929** год — нарадзіўся (в. Мядзведня Старадарожскага раёна) Іван Нікіфаравіч Стасевіч, мастак, заслужаны дзеяч мастацтваў Беларусі). Пісаў сюжэтна-тэматычныя карціны, партрэты, пейзажы, нацюрморты. Сярод работ: «Брэсцкая крэпасць», «Шахцёры Салігорска», «Неўміручасць» і іншыя.

**1954** год — у Беларусі былі ліквідаваныя вобласці: Бабруйская, Баранавіцкая, Палеская з цэнтрамі ў Бабруйску, Баранавічах і Мазыры.




**1778** год — англійскі мараплавец і навігатар Джэймс Кук адкрыў Гавайскія астравы.

**1851** год — французскі фізік, механік і астраном Жан Бернар Леон Фуко даказаў, што Зямля круціцца вакол сваёй восі.



**1910** год — нарадзілася Галіна Сяргееўна Уланава, савецкая і расійская балерына, народная артыстка СССР, двойчы Герой Сацыялістычнай Працы. З 1928 года — салістка Ленінградскага тэатра оперы і балета імя Кірава, з 1944-га — вядучая салістка Вялікага тэатра ў Маскве. Развівала прынцыпы і традыцыі рускай балетнай школы. Чатыры разы лаўрэат Дзяржаўных прэмій СССР, Ленінскай прэміі.

**1979** год — пачатак Іранскай рэвалюцыі, вынікам якой сталі эміграцыя шаха Махамеда Рэза Пехлеві, скасаванне манархіі і ўсталяванне новай адміністрацыі, якую ўзначаліў аятала Хамейні.

КРЫМІНАЛ

## «ТЭЛЕФОННАЕ» ІНВЕСТАВАННЕ ДАБРОМ НЕ КАНЧАЕЦЦА

Упраўленне інфармацыі і грамадскіх сувязяў Нацыянальнага банка нашай краіны звяртае ўвагу на высокую верагоднасць росту актыўнасці махляроў у навагоднія святы.

Спецыялісты Нацбанка паведамляюць, што для падману грамадзян цяпер часцей за ўсё выкарыстоўваюцца наступныя ашуканскія схемы:

— «інвеставанне» ў вядомыя беларускія кампаніі (у тым ліку з выкарыстаннем крыптавалюты);

— «купля» тавараў па нізкіх цэнах у сацсетках і месенджарах;

— выкананне даручэнняў «кіраўніка» (схема «Fake Boss»).

Як менавіта працуюць гэтыя схемы і як не стаць лёгкай здабычай ашуканцаў?

**Схема 1. «Інвеставанне» ў вядомыя беларускія кампаніі.**

У сетцы інтэрнэт размяшчаюцца прапановы інвеставаць грошы ў дзейнасць буйнога беларускага прадпрыемства. Для куплі акцый або аблігацый вядомага брэнда трэба зарэгістравацца на прапанаванай анлайн-платформе, увёўшы даныя, з дапамогай якіх ашуканцы атрымліваюць доступ да вашага банкаўскага рахунку.

### Як не папасціся на гэты выкрут?

Праверце інфармацыю аб прапанаванай схеме інвеставання ў некалькіх крыніцах (афіцыйныя сайты прадпрыемстваў, дзяржаўных органаў, сродкаў масавай інфармацыі);

— не прымайце хуткіх рашэнняў, асабліва калі на вас аказваюць ціск або прыспешваюць. Вазьміце паўзу, каб абдумаць прапанову, вывучыць інфармацыю, пракансультавацца з дасведчанымі людзьмі;

— не пераходзьце па падазроных спасылках, асабліва з незнаёмых адрасоў, якія заклікаюць здзейсніць інвестыцыі.

**Схема 2. «Купля» тавараў па нізкіх цэнах у сацсетках і месенджарах.**

Увага! Патэнцыйных ахвяр ашуканцы прыцягваюць акцыямі, зніжкамі. Згадваючы пра тое, што колькасць тавару абмежавана, прыспешваюць з купляй і прапануюць перавесці перадаплату за «дэфіцытны» тавар. Вынік — ні тавару, ні грошай.

### Чаго не трэба рабіць?

Не пераводзьце перадаплату да атрымання тавару;

— пашукайце рэальныя водгукі аб прадаўцу;

— ніколі не пераходзьце па невядомых спасылках для аплаты тавару.

**Схема 3. Выкананне даручэнняў «кіраўніка» (схема «Fake Boss»).**

Ашуканцы пранікаюць у чаты працоўных калектываў у месенджарах, збіраюць інфармацыю аб арганізацыі і кіраўніках, ствараюць уліковыя запісы ад іх імя. Далей з дапамогай фэйкавага акаўнта кіраўніка яны ўступаюць у перапіску з падначаленымі і, выкарыстоўваючы давер да начальніка, даюць пэўныя ўказанні.

Напрыклад, чалавек атрымлівае паведамленне ад нібыта свайго кіраўніка аб званку ад «супрацоўніка праваахоўных органаў». Затым уяўны праваахоўнік паведамляе ахвяры аб яе ўцягнутасці ў ашуканскую схему і рэкамендуе перавесці сродкі на «бяспечныя» рахункі. Далей у гульню ўступае «супрацоўнік банка», які раіць прадаць маёмасць або аформіць крэдыт. Ашуканы грамадзянін прытрымліваецца інструкцый і пераводзіць грошы на паказаны ашуканцамі рахунак.

### Як паступаць у гэтым выпадку?

Звярніце ўвагу на нумар тэлефона і назву акаўнта, з якога паступіла паведамленне, паспрабуйце зверыцца з вядомымі вам кантактнымі данымі, пры неабходнасці ўдакладніце іх сапраўднасць у калег;

— паспрабуйце асабіста звязацца з кіраўніком па вядомым вам нумары тэлефона і ўдакладніце, ці паступалі ад яго распараджэнні.

У кожнай сітуацыі захоўвайце разважлівасць, халодную галаву, не паддавайцеся эмоцыям, а галоўнае — нікому не паведамляйце канфідэнцыяльную інфармацыю.

**Сяргей КУРКАЧ.**

Дарагую **Валянціну Аркадзеўну КУПЧЭНЮ** шчыра віншуем з прыгожай круглай датай!



Зычым
*На многія леты здароўя, дабра!*
*Хай кожны дзянёк будзе ў свята!*
*Хай дом за вярсту абыходзіць бяда,*
*А радасці будзе багата!*

**Сям'я РАБЦАВЫХ.**


ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Рэгістрацыйнае пасведчанне нумар 2 ад 17 лютага 2009 года, выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Дырэктар — галоўны рэдактар АНУФРЫЕВА Вольга Аляксандраўна.

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 311 17 13 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 311 17 44, маркетынгу — 263 66 73, бухгалтэрыі — 311 17 16.

прыём рэкламы тэл./факс: 311 17 27, e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

www.zviazda.by

e-mail: info@zviazda.by (для зваротаў): zvarot@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 38200000007667 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, прасп. Незалежнасці, 79/1. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 12 698. Індэкс 63850. Зак. № 75.

Нумар падпісаны ў 19.30 7 студзеня 2025 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12